УДК 947.6

П.В.Дзядзюля, дацэнт

# РОЛЯ АДУКАЦЫІ Ў СТАНАЎЛЕННІ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Інстытут адукацыі з'яўляецца неад'емнай часткай працэсу станаўлення дзяржавы. У ім з'яўляюцца нормы, правілы, законы, якія захоўваюцца і перадаюцца наступным пакаленням. Паступова ўзнікаюць спецыфічныя ўстановы, людзі, адказныя за выкананне новых функцый.

Вядома, што першыя дзяржаўныя аб'яднанні на тэрыторыі Беларусі склаліся на рубяжы нашай эры (Юхо Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. М. 1992. С.50). Полацкае княства існавала ўжо ў IX ст. з усімі прыкметамі дзяржаўнасці. Прыблізна ў гэты час з' явілася пісьменнасць. Хрысціянства садзейнічала распаўсюджванню граматнасці на аснове азбукі, якую распрацавалі Кірыл і Мяфодзій. Неабходнасць упраўляць справамі дзяржавы патрабавала пісьменных людзей. Паступова з' явіліся школы, складвалася сістэма адукацыі. У Полацкім, Тураўскім і іншых княствах збіралі дзяцей свяшчэннікаў, знатных гараджан, каб рыхтаваць пісьменных і вучоных людзей для "царкоўных спраў" і ўпраўлення княствамі (Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мн. , 1968. С.8). Праславіліся сваёй самаахвярнасцю ў арганізацыі асветы Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі.

З узнікненнем Вялікага княства Літоўскага інстытут адукацыі стаў важнейшай часткай дзяржавы, аб'ектам яе клопатаў. Развіццё сельскай гаспадаркі, рамёстваў, гандлю, умацаванне дзяржаўнасці вялі да ўтварэння рынку, што садзейнічала фарміраванню беларускай народнасці і яе культуры. Дзяржава, яе эканамічная, палітычная эліта клапоцяцца пра асвету, кнігадрукаванне, мастацтва. У авалоданні пісьменнасцю мелі патрэбу не толькі вярхі грамадства, але і рамеснікі, купцы. У гарадах і буйных маёнтках узніклі школы. У XVI, XVII стст. з'яўляюцца пратэстанцкія школы, у праграме навучання якіх значнае месца займаюць прыродазнаўчыя навукі.

Дзяржаўныя інтарэсы княства патрабавалі ўсё больш і больш адукаваных людзей. Таму ў Віленскай езуіцкай акадэміі, якая мела статус універсітэта, з 1644 г. пачалі рыхтаваць побач з багасловамі, філосафамі і юрыстаў.

Развіццё міжнародных палітычных, культурных, гандлевых сувязей, растучая неабходнасць у вывучэнні замежных моў, гуманітарных і прыродазнаўчых навук садзейнічалі пашырэнню зарубежнай універсітэцкай адукацыі. Асобую ролю ў гэтым працэсе выконвалі Ягелонскі і Кенігзберскі універсітэты, дзе толькі ў XVI ст. навучалася звыш 400 вы-

выхадцаў з ВКЛ. Маладыя людзі з Беларусі, Украіны, Літвы мелі магчымасць вучыцца ў Падуі, Ляйпцыгу, Празе, Цюбінгене, Базелі і іншых гарадах Еўропы ( Статут ВКЛ 1588 г. Мн., 1989. С. 16).

Пасля Люблінскай уніі ўзмацніўся ўплыў Польшчы на ўвесь уклад жыцця ў княстве. Сістэма адукацыі паступова пераходзіла на польскую мову і ўсё больш пранізвалася польскім патрыятычным духам, садзейнічаючы ўмацаванню польскай дзяржаўнасці на тэрыторыі Вялікага княства.

Урад Расійскай імперыі пасля раздзелу Рэчы Паспалітай, клапоцячыся аб умацаванні свайго ўплыву ў далучаных землях, перабудоўваў у Беларусі і Літве не толькі адміністрацыйную сістэму, але і ствараў патрэбную ёй школу. Адукацыя побач з царквою станавілася сферай фарміравання сапраўдных грамадзян Расіі ў духу пакорлівасці і адданасці рускаму цару.

Напярэдадні і ў час паўстання 1863 г. К.Каліноўскі спрабаваў пераканаць беларусаў у неабходнасці барацьбы за свабоду, за нацыянальную дзяржаўнасць і за тое, каб вучыць сваіх дзяцей у школах на беларускай мове.

У перыяд масавых нацыянальна-дэмакратычных рухаў у Расіі на рубяжы стагоддзяў заявіла пра сябе палітычная партыя “Беларуская сацыялістычная Грамада”, якая была арганізавана ў 1903 г. У абноўленай яе праграме, надрукаванай у 1906 г., было патрабаванне аўтаноміі для Беларусі і стварэння абавязковай бясплатнай адукацыі з правам вучыцца на роднай мове ( Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, Т.1. С.411).

У пачатку XX ст. заметна ўзрасла колькасць беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі. Значная яе частка групіравалася ў Вільні вакол газеты “Наша ніва”. У час акупацыі Заходняй Беларусі немцамі беларусы, услед за палякамі і літоўцамі, скарысталі іх дазвол на нацыянальна-культурную работу і адкрылі звыш 80 школ, настаўніцкую семінарыю ў Свіслачы, гімназію ў Будславе. Насуперак забароне акупантаў на палітычную дзейнасць у 1915 г. у Вільні ўтварыўся агульнанацыянальны канспіратыўны орган - Беларускі Народны Камітэт, які ставіў задачу стварэння разам з літоўцамі новага Вялікага княства Літоўскага (Газета “Голас Радзімы”, 1944, 41).

Пасля звяржэння царызму нацыянальна-дэмакратычны рух на тэрыторыі Расійскай імперыі рэзка ўзмацніўся. 25-26 сакавіка 1917 г. у Мінску адбыўся з’езд прадстаўнікоў беларускіх арганізацый і партый. Створаны ім Беларускі Нацыянальны Камітэт павінен быў стаць вышэйшай краёвай уладай. Вызначаная з’ездам дэлегацыя наведала Петраград і прад’явіла Часоваму ўраду дэкларацыю , у якой утрымліваліся патрабаванні аб беларусізацыі школы і аўтаноміі Беларусі. Патрабавалі аўтаноміі Беларусі і беларускіх школ некаторыя арганізацыі, якія ўзніклі сярод бежанцаў у гарадах Расіі.

Больш настойлівымі ў дасягненні сваіх мэтаў беларускія дзеячы сталі пасля кастрычніцкіх падзей у Петраградзе. Большасць беларускіх арганізацый імкнулася пераканаць, арганізаваць, павесці народ на будаўніцтва сваёй дзяржавы. Ва ўмовах , калі Беларусь падзяліў фронт, а многія палітычныя сілы, якія тут дзейнічалі, ва ўпор не бачылі беларусаў, неабходны быў магутны штуршок да аб'яднання ўсіх нацыянальна-дэмакратычных сіл.

Найвялікшая падрыхтоўчая работа дазволіла ў снежні 1917 г. склікаць у Мінску Усебеларускі з'езд, на які прыбыло амаль 2000 дэлегатаў з ўсёй Беларусі і з многіх рэгіёнаў Расіі, з фронту, флоту. Пасля нялёгкага пачатку, шматлікіх спрэчак дэлегаты з'езда сталі схіляцца да стварэння органаў мясцовай улады, незалежных ад улады бальшавікоў. Момант гэты ўлавіла кіраўніцтва бальшавіцкага Савета Народных Камісараў Заходняй вобласці і сілай разагнала першы ў навейшай гісторыі прадстаўнічы форум беларускага народа,які ставіў высакародную задачу адраджэння Беларусі.

Выбраная з'ездам Усебеларуская Рада Сялянскіх, Салдацкіх і Рабочых Дэпутатаў працягвала работу, знаходзячыся на нелегальным становішчы. Пасля таго як 19 лютага 1918 г. бальшавікі перад наступленнем немцаў пакінулі Мінск, Выканаўчы Камітэт Усебеларускай Рады 21 лютага аб'явіў сябе часовай уладай Беларусі і стварыў урад - Народны Сакратарыят Беларусі. У наступных дакументах дэкларавяліся роўнасць моў, права на адукацыю, і 25 сакавіка 1918 г. Беларуская Народная Рэспубліка аб'яўлялася незалежнай дзяржавай (Турук Ф. Белорусское движение.- М., 1921. С.116).

12 красавіка Народны Сакратарыят БНР прыняў пастанову аб наданні беларускай мове статусу дзяржаўнай і абавязковай для грамадзян рэспублікі. Курыравалі сістэму адукацыі па заданню ўрада Б.Тарашэвіч, Я.Карскі, В.Іваноўскі. Распрацоўваліся вучэбныя праграмы, ствараліся падручнікі. Пачала работу камісія пад кіраўніцтвам М.Доўнар-Запольскага па стварэнні Беларускага універсітэта. У Мінску пачаў работу педагагічны інстытут, завяршалася падрыхтоўка да адкрыцця кансерваторыі. У Слуцку і Браславе ўжо працавалі гімназіі.

Кіраўніцтва БНР рабіла ўсё магчымае, каб ва ўмовах акупацыі стварыць умовы для павышэння адукаванасці насельніцтва. Немцы абмяжоўвалі палітычную, эканамічную дзейнасць урада і не перашкаджалі культурнай рабоце. У тых умовах нацыянальная школа была важнейшым сродкам умацавання дзяржаўнасці (Газета "Голас Радзімы", 1994, 48).

Важнае месца ў ліку прыярытэтаў Савецкай Беларусі займала нацыянальная адукацыя. Паступова пераадольваўся нігілізм многіх партыйных і дзяржаўных работнікаў да беларускай мовы, беларускай школы, культуры. Ужо у 20-я гады пачалася кампанія "беларусізацыі": паўсюдна адчыняюцца школы, тэхнікумы, вышэйшыя вучэбныя ўстановы. Кіраўніцтва рэс-

публікі настойліва паўтарае, што будаўніцтва сацыялістычнай дзяржавы немагчыма без адукаваных людзей. Больш таго, ствараюцца адпаведныя структуры, каб навучыць грамаце старэйшыя ўзроставыя групы насельніцтва, якія не мелі магчымасці ў ранейшыя гады вучыцца ў школе.

Са сказанага напрашваецца вывад; адукацыя і дзяржаўнасць - з'явы дыялектычна ўзаемазвязаныя. Беларусь у сілу асаблівасці яе гістарычнага шляху так і не змагла ў поўнай меры стварыць нацыянальную сістэму адукацыі і моцную нацыянальную дзяржаву.

УДК 947.6

П.С.Кручак, асістэнт

## АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ М.В.ДОЎНАР-ЗАПОЛЬСКАГА (1906-1917 гг.)

Вядомы беларускі гісторык і грамадскі дзеяч М.В.Доўнар-Запольскі (1867-1934) праявіў сябе і як таленавіты педагог-арганізатар. Асабліва ярка гэты накірунак дзейнасці вучонага праявіўся ў 1906-1917 гадах, калі М.В.Доўнар-Запольскі з'яўляўся арганізатарам і кіраўніком першай у Расійскай імперыі навучальнай установы з эканамічным ухілам - Кіеўскага камерцыйнага інстытута.

У гэты час, калі краіна ўступіла ў новы этап свайго эканамічнага развіцця, само жыццё патрабавала спецыялістаў з вышэйшай эканамічнай адукацыяй, якія б маглі працаваць у розных галінах народнай гаспадаркі. З гэтай мэтай пры падтрымцы Міністэрства прамысловасці і гандлю ў 1906 г. М.Доўнар-Запольскі адкрывае ў Кіеве вышэйшыя камерцыйныя курсы, якія ў хуткім часе атрымалі статус інстытута. М.Доўнар-Запольскі з'яўляўся не толькі арганізатарам і нязменным кіраўніком, але і сапраўднай душой новай навучальнай установы. Пазней ён пісаў, што пачынаць працу прыходзілася амаль што з нуля - не было ні сродкаў, ні вучэбных праграм, ні выкладчыкаў, згодных працаваць ва ўстанове новага тыпу. Усё даводзілася арганізоўваць самому дырэктару. Яму ўдалося дабіцца падтрымкі мясцовых гандлёва-прамысловых колаў. Гэта дало свае вынікі. Калі ў 1907 г. інстытуту належаў адзін маленькі домік, то ўжо ў 1917 г. ён з'яўляўся ўласнікам амаль паловы квартала шматпавярховых будынкаў з добрымі аўдыторыямі, багатай бібліятэкай і адзіным на ўсю краіну гандлёва-прамысловым музеем.

Галоўнае ж было ў самой сістэме навучання. Кіеўскі камерцыйны інстытут падначальваўся не Міністэрству народнай асветы, а Міністэрству прамысловасці і гандлю, якое адрознівалася сваім лібералізмам і якое да-